# Васіль Іванавіч КАЗЛОЎ

2 снежня 1967 года пасля працяглай і цяжкай хваробы памёр відны партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, член ЦК КПСС, намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, член бюро ЦК КП Беларусі, Герой Савецкага Саюза Васіль Іванавіч Казлоў.

В. І. Казлоў нарадзіўся ў 1903 годзе ў вёсцы Заграддзе Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. Сваю працоўную дзейнасць ён пачаў рабочым на чыгуначным транспарце. У 1927 годзе ўступіў у рады Камуністычнай партыі. Пасля заканчэння ў 1933 годзе Камуністычнага універсітэта В. І. Казлоў, будучы дырэктарам машынна-трактарнай станцыі, а затым першым сакратаром Старобінскага і Чэрвеньскага райкомаў партыі, актыўна ўдзельнічаў у правядзенні калектывізацыі. У 1940 годзе Васіль Іванавіч быў вылучаны на пасаду намесніка Старшыні Савета Народных Камісараў БССР, а ў 1941 годзе выбран другім сакратаром Мінскага абкома КП Беларусі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны В. І. Казлоў па рашэнню ЦК КП Беларусі знаходзіўся ў тыле ворага ў якасці першага сакратара Мінскага падпольнага абкома і гаркома партыі. Васіль Іванавіч з уласцівай яму бальшавіцкай энергіяй праводзіў вялікую работу па стварэнню падпольных партыйных арганізацый і партызанскіх атрадаў, узначальваў адно з буйнейшых у рэспубліцы партызанскіх злучэнняў і праявіў сябе як выдатны кіраўнік партызанскага руху. Яму было прысвоена воінскае званне генерал-маёра.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў В. І. Казлоў, узначальваючы Мінскую абласную і гарадскую партыйныя арганізацыі, правёў вялікую работу па аднаўленню разбуранай ворагам народнай гаспадаркі вобласці і сталіцы рэспублікі — горада Мінска. З 1948 года Васіль Іванавіч Казлоў — Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Ён быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР 2-га, 3-га, 4-га, 5-га, 6-га, 7-га скліканняў, дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. На XX, XXII з'ездах партыі выбіраўся кандыдатам у члены ЦК КПСС, а на XXIII з'ездзе — членам ЦК КПСС.

Радзіма высока адзначыла шматгранную дзейнасць В. І. Казлова. За выдатныя заслугі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, праяўлены гераізм, мужнасць і адвагу В. І. Казлоў быў удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза. Ён узнагароджан пяццю ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і многімі медалямі.

Усё сваё свядомае жыццё Васіль Іванавіч Казлоў прысвяціў вернаму служэнню Камуністычнай партыі, савецкаму народу. Высокая партыйная прынцыповасць, патрабавальнасць да сябе, прастата і сціпласць, чуласць і ўвага да людзей здабылі яму любоў і павагу ўсіх, хто яго ведаў. Светлая памяць аб Васілю Іванавічу Казлове назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ